ІЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА

УДК 37.034

*Крываносава Алена Эдвардаўна*

# ІДЭІ МАРАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ

**13.00.01** – агульная педагогіка

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук

Віцебск, 1998

Праца выканана ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П.М.Машэрава

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік | доктар педагагічных навук **Арлова Г.П.** |
| Афіцыйныя апаненты | доктар педагагічных навук, прафесар **ЗубрА.С.** |
| | кандыдат педагагічных навук, дацэнт **Зінькова Н.К.** |
| Апаніруючая арганізацыя | **Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М.Танка** |

Абарона адбудзецца 26 лістапада 1998 года ў 14 гадзін на пасяджэнні Савета па абароне дысертацый К.02.20.01 на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук у Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П.М.Машэрава па адрасу: 210036, г.Віцебск, Маскоўскі пр-т, 33, ауд. 407 (корпус МГФ), тэл. 25-74-70.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М.Машэрава.

Аўтарэферат разасланы 26 кастрычніка 1998 года.

Вучоны сакратар Савета
па абароне дысертацый,
кандыдат педагагічных навук,
прафесар С.І.Сталярова

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі**. Эканамічная і сацыяльная трансфармацыя прывяла да зніжэння грамадскага маральнага тонусу, якое выяўляецца ў поўным ігнараванні норм маралі, дэвальвацыі этычных і эстэтычных каштоўнасцей, страце былых ідэалаў, разбурэнні сістэмы пераемнасці пакаленняў у галіне культурных традыцый, жыццёвага ўкладу. Таму ў складаных сучасных умовах трэба звярнуцца да нашых вытокаў сумленнасці, сардэчнасці, дабрыні – беларускай народнай педагогікі.

Актуальнасць звароту да выбранай тэмы абумоўлена і тым, што маецца цэлы шэраг этнапедагагічных даследаванняў, якія прысвечаны пытанням маральнага выхавання ў народнай педагогіцы розных нацый і народнасцей. Навуковую цікавасць уяўляюць працы па народнай педагогіцы кіргізаў (К.І.Бяшымаў, 1975, С.М.Саіпбасў, 1978), малдаван (В.М.Валяева, 1974), чувашоў (Г.Н.Волкаў, 1958, 1974, 1979, 1982), азербайджанцаў (А.Ш.Гашымаў, 1970), башкір (Т.К.Іскакаў, 1981, Ю.З.Кутлугільдзіна, 1984, А.М.Сафін, 1995), тувінцаў (Т.Г.Мунзук, 1990, Г.Д.Сундуй, 1993), кіргізаў (М.Сайфулаева, 1986), украінцаў (М.І.Сцельмаховіч, 1989, А.І.Сяваўка, 1974), татар (Я.І.Ханбікаў, 1967), адыгаў (І.А.Шораў, 1989, 1994) і г.д. У гэтых даследаваннях даецца аналіз ролі народнай творчасці, народных традыцый у маральным выхаванні падрастаючага пакалення; раскрываецца значэнне народных педагагічных ідэй у фарміраванні духоўнага свету асобы; паказваецца абумоўленасць патрабаванняў народа да чалавечых якасцей, важнейшых рыс характару гістарычнымі, працоўнымі, прыроднымі фактарамі. У залежнасці ад гэтага аўтары раскрываюць змест народнага маральнага кодэкса таго ці іншага народа. Некаторыя этнапедагогі засяроджваюць увагу на пытанні народна педагагічных сродкаў і метадаў маральнага выхавання.

Што да вывучэння розных аспектаў народнай педагогікі беларусаў, трэба адзначыць плённыя даследаванні Г.П.Арловай, прысвечаныя вывучэнню навуковых асноў пераемнасці навуковай і народнай педагогікі, значэння апошняй у фарміраванні тэорыі маральнага выхавання; артыкулы В.С.Болбаса, якія адлюстроўваюць вынікі даследавання аўтарам сямейнага выхавання ў феадальнай Беларусі і магчымасці выкарыстання этнапедагагічных ведаў у сучасным сямейным выхаванні; вучэбныя дапаможнікі А.А.Грымаца прыкладной накіраванасці для будучых педагогаў, выхавальнікаў дзіцячых садкоў і настаўнікаў агульнаадукацыйных школ, К.А.Кулінковіча, які даследуе вытокі беларускай нацыянальнай педагогікі; працы аўтарскіх калектываў пад рэдакцыяй С.В.Спанкоўскай, Я.І.Сярмяжкі, што раскрываюць погляды беларускага народа на некаторыя праблемы выхавання.

Безумоўна, пытанні маральнага выхавання ў народнай педагогіцы закраналіся аўтарамі, але разам з тым маральна-выхаваўчы патэнцыял беларускай народнай педагогікі недастаткова цэласна асветлены ў этнапедагагічнай літаратуры, няма навуковай працы, якая цалкам была б

прысвечана паслядоўнаму раскрыццю ідэй маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы.

Неабходнасць даследавання тлумачыцца таксама недастатковым улікам праграмамі школ і ВНУ асаблівасцей маральнага ўплыву народнай педагогікі на выхаванцаў (і гэта нягледзячы на новае асэнсаванне нацыянальнай сістэмы выхавання, прызначанай садзейнічаць развіццю асобы на глебе нацыянальнай культуры, часткай якой з'яўляецца і народная педагогіка). Атрымліваецца, што, з аднаго боку, выхаваўчыя інстытуты адчуваюць вострую патрэбу ў выкарыстанні народных педагагічных традыцый, асабліва ў галіне маральнага выхавання, а з другога боку, недахоп ведаў па азначанай праблеме беларускай народнай педагогікі робіць малаэфектыўным яе прымяненне ў тэорыі і практыцы маральнага выхавання. Гэта і зразумела. Перш чым выкарыстоўваць беларускую народную педагогіку для забеспячэння новай якасці маральнага выхавання, здольнай адэкватна адказаць на ўсе запыты развіцця асобы, трэба мець трывалую базу ведаў па азначанай праблеме, якой, на жаль, не хапае.

Такім чынам, вышэйпададзеныя акалічнасці прадвызначылі выбар тэмы дысертацыйнага даследавання "Ідэі маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы".

**Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Даследаванне ўяўляе адзін з напрамкаў, якія распрацоўваюцца ў рамках навуковай школы ВДУ па праблемах этнапедагогікі.

**Мэта даследавання** – на аснове вывучэння, аналізу, абагульнення этнапедагагічнага, этнаграфічнага і фальклорнага матэрыялу беларускага народа раскрыць вядучыя ідэі маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы.

Зыходзячы з мэты даследавання, аўтарам былі акрэслены наступныя **задачы**:

– распрацаваць тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання ідэй маральнага выхавання ў народнай педагогіцы;

– вызначыць мэту маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы;

– класіфікаваць метады і прыёмы маральнага выхавання ў народнай педагогіцы беларусаў і даць характарыстыку асноўных народна-педагагічных сродкаў, метадаў, прыёмаў;

– паказаць працэс рэалізацыі асноўных ідэй маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы (выхаванне працавітасці, патрыятызму, чалавечнасці).

**Аб'ектам даследавання** з'яўляецца беларуская народная педагогіка.

**Прадмет даследавання** – ідэі маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы.

**Гіпотэза даследавання.** У беларускай народнай педагогіцы ідэі маральнага выхавання як форма пазнання выхаваўчага працэсу ўключаюць

усведамленне мэты, сродкаў, шляхоў яе дасягнення і актыўна ўплываюць на маральна-выхаваўчую практыку народа.

**Метадалагічнай асновай даследавання** паслужылі філасофскія канцэпцыі структуры і зместу грамадскай свядомасці, яе месца і ролі ў фарміраванні асобы; агульныя дыялектычныя прынцыпы, якія вызначылі выходныя пазіцыі даследавання (дыялектыка ўсеагульнай сувязі, узаемаабумоўленасці і цэласнасці з'яў рэальнага свету; агульнафіласофскія палажэнні аб ролі народа ў стварэнні духоўных і маральных каштоўнасцей, аб своеасаблівасці і самабытнасці культур розных нацый; прынцып адзінства нацыянальнага і агульначалавечага і г.д.); працы вядучых педагогаў, што раскрываюць ідэю народнасці выхавання; навуковыя працы, у якіх выкладаюцца тэарэтычныя і практычныя пытанні маральнага выхавання.

Для рашэння пастаўленых задач выкарыстоўваліся наступныя **метады**: параўнальны аналіз і абагульненне філасофскіх, педагагічных, этнапедагагічных, этнаграфічных прац; падбор і функцыянальны аналіз матэрыялаў беларускай вуснай народнай творчасці ў кантэксце тэмы даследавання.

**Навуковая навізна вынікаў даследавання.** На аснове вывучэння этнапедагагічнай, філасофскай літаратуры абгрунтаваны навуковы падыход да даследавання праблемы ідэй маральнага выхавання ў народнай педагогіцы. Шляхам этнапедагагічнага аналізу этнаграфічнага і фальклорнага матэрыялу:

– выяўлена, што маральнае выхаванне ў беларускай народнай педагогіцы мела мэтанакіраваны характар: фарміраванне асобасных якасцей выхаванцаў згодна з маральным ідэалам народа; канструяванне апошняга паказана ў адзінстве з асаблівасцямі нацыянальнага характару беларусаў;

распрацавана класіфікацыя народна-педагагічных метадаў і прыёмаў маральнага выхавання з удакладненнем характарыстыкі асноўных з іх;

– паказана ажыццяўленне асноўных ідэй маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы (выхаванне працавітасці, патрыятызму, чалавечнасці).

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў** заключаецца ў тым, што адкрываюцца патэнцыяльныя магчымасці выкарыстання матэрыялаў даследавання, атрыманых звестак у галіне маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы ў сістэме бесперапыннай адукацыі і выхавання: у сямейным выхаванні, самавыхаванні, у вучэбна-выхаваўчым працэсе дзіцячых садкоў і школ, у лекцыйных курсах і на семінарскіх занятках па гісторыі педагогікі, этнапедагогіцы, у сістэме павышэння кваліфікацыі педагогаў.

**Сацыяльна-эканамічная значнасць атрыманых вынікаў**. Без перабольшвання можна сказаць, што ад маральнага стану нацыі сёння шмат у чым залежыць ход эканамічнага, сацыяльна-палітычнага і культурнага развіцця краіны. Зразумела, што вынікі выхаваўчай работы нельга перадаць лічбамі ў грашовым эквіваленце, ацаніць з матэрыяльнага пункту гледжання. Але расткі дабра, сумленных адносін да працы, любві да краіны і свайго народа, якія

узыдуць у сэрцах маладых на глебе тых вечных каштоўнасцей, што дае нам народная педагогіка, будуць садзейнічаць духоўнаму аздараўленню грамадства, а значыць, прынясуць і пэўны эканамічны эфект.

**Асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону**:

1. Народная педагогіка – галіна вопыту народа па пытаннях навучання і выхавання падрастаючых пакаленняў, які знаходзіць выяўленне ў сукупнасці педагагічных ведаў, уменняў і навыкаў педагагічнай дзейнасці на ўзроўні штодзённай свядомасці.

2. Маральнае выхаванне ў народнай педагогіцы накіравана на засваенне дзецьмі пэўнай сумы маральных ведаў, на арганізацыю такой сістэмы паводзін, якія б дазволілі выхаванцам дасягнуць узроўню маральнага ідэалу народа. Маральны ідэал як адлюстраванне мэты маральнага выхавання ў народнай педагогіцы грунтуецца на фундаменце нацыянальнага характару, на самаўяўленні беларусаў пра свае якасці. Узяўшы за аснову ўсё лепшае з нацыянальнага характару (працавітасць, патрыятызм, талерантнасць, чалавечнасць, цярплівасць, разважнасць), беларусы ўключаюць у маральны ідэал тыя рысы, якія адсутнічаюць у нацыянальным характары, але ўспрымаюцца народам у якасці неабходнага элемента мадэлі маральна дасканалай асобы (рашучасць, настойлівасць у абароне поглядаў, пачуцця годнасці).

3. Народна-педагагічныя метады і прыёмы маральнага выхавання ў рамках дзейнаснага падыходу можна пэўным чынам класіфікаваць: метады фарміравання маральнага ідэалу народа ў свядомасці выхаванцаў (патрабаванне, пераконанне, прыклад), метады арганізацыі адпаведнай маральнаму ідэалу жыццядзейнасці (прывучэнне, практыкаванне), метады ацэнкі і стымулявання чалавечых паводзін (заахвочванне, пераконанне, выпрабаванне). Народна-педагагічны комплекс сродкаў і метадаў, якія ўплываюць на маральны рост чалавека, валодае цэльнасцю ўздзеяння на ўсе бакі маральнага жыцця асобы, рухомымі сувязямі паміж структурнымі кампанентамі.

4. Ідэі маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы рэалізуюцца ў працэсе выхавання працавітасці (прыхільнасці да працы, разумення значнасці добрасумленнай працы ў жыцці чалавека, авалодання працоўнымі ўменнямі і навыкамі, павагі да людзей працы), патрыятызму (прыхільнасці да месца нараджэння, вернасці айчыне, павагі да роднай мовы, традыцый культуры і быту, да гістарычнага мінулага, гатоўнасці абараняць бацькаўшчыну ад ворагаў), чалавечнасці (добразычлівасці, сціпласці, павагі, спачування, велікадушнасці, сумленнасці, шчырасці).

**Асабісты ўклад саіскальніка**. Дысертацыя ўяўляе сабой самастойную навуковую працу па распрацоўцы навуковага падыходу да даследавання праблемы ідэй маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы. Тэма даследавання распрацоўвалася аўтарам з 1992 года. Сфармуляваныя ў працы

палажэнні, якія датычацца раскрыцця сутнасці народна-педагагічных ідэй маральнага выхавання і практыкі народа па іх ажыццяўленні, – гэта вынік асабістага пошуку і намаганняў дысертанта. Вывады і заключэнні, якія змешчаны ў працы, зроблены на аснове дасягненняў этнапедагагічнай, этнаграфічнай, філасофскай і фалькларыстычнай навукі.

**Апрабацыя вынікаў даследавання**.Асноўныя палажэнні і вынікі тэарэтычнага даследавання абмяркоўваліся на пасяджэннях кафедры педагогікі ВДУ, на II (49) навуковай сесіі прафесарска-выкладчыцкага саставу (1997); дакладваліся на навуковай гуманітарнай студэнцкай канферэнцыі (г.Віцебск, 1993), рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Роля сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у фарміраванні каштоўнасных арыентацый будучага настаўніка (г.Віцебск, 1994), абласной навукова-практычнай канферэнцыі "Праблемы сацыялізацыі дзяцей і падлеткаў у сучаснай грамадскай сітуацыі" (г.Віцебск, 1995), абласной навукова-практычнай канферэнцыі "Маральна-прававое выхаванне: вопыт, праблемы, перспектывы" (г.Віцебск, 1997), навукова-практычнай канферэнцыі "Моладзь у працэсе сацыялізацыі" (г.Віцебск, 1997), рэспубліканскай навукова-метадычнай канферэнцыі "Прафесіянальная культура педагога як вызначальны фактар абнаўлення школы" (г.Віцебск, 1997), рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Моладзь. Новае пакаленне. Асоба" (г.Віцебск, 1998). Назапашаны дысертантам матэрыял выкарыстоўваўся пры арганізацыі навукова-даследчай працы студэнтаў на факультэтах педагогікі і методыкі пачатковага навучання і дашкольнага выхавання ВДУ; пры распрацоўцы тэматыкі курсавых прац, у працы навуковага гуртка «Народная педагогіка»; пры правядзенні выхаваўчых мерапрыемстваў у аздараўленчых лагерах; у час працы настаўнікам пачатковых класаў у сярэдняй школе №32 г. Віцебска.

**Апублікаванасць вынікаў**. Асноўныя палажэнні даследавання знайшлі адлюстраванне ў 11 публікацыях аўтара, у тым ліку ў навуковым часопісе - 2, у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый - 4, у зборніках тэзісаў дакладаў навуковых канферэнцый - 3, у зборніках метадычных рэкамендацый - 2. Агульны аб'ём публікацый – 34 старонкі.

**Структура і аб'ём дысертацыі**. Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, дзвюх глаў і заключэння. Поўны аб'ём дысертацыі – 124 старонкі. Спіс выкарыстаных літаратурных крыніц займае 19 старонак і ўключае ў сябе 286 найменняў.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ПРАЦЫ

Першая глава *"Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання ідэй маральнага выхавання ў народнай педагогіцы беларусаў"* прысвечана вывучэнню распрацаванасці ў педагагічнай навуцы праблемы ідэй маральнага выхавання ў народнай педагогіцы, вызначэнню параметрычных характарыстык

праблемы даследавання, раскрыццю мэты маральнага выхавання, сродкаў і метадаў яе дасягнення ў беларускай народнай педагогіцы.

У ходзе даследавання аўтарам быў прааналізаваны і абагульнены шэраг літаратурных крыніц, што датычацца тэмы дысертацыі, сярод якіх працы па філасофіі, педагогіцы, этнапедагогіцы, этнаграфіі, народнай творчасці.

Філасофія, даследуючы сутнасць, прынцыпы і заканамернасці быцця, яго пазнання, стаўленне чалавека да свету, сэнс чалавечага існавання, выступае агульнай метадалогіяй пазнання сацыяльных з'яў. Таму раскрыццё тэмы патрабавала знаёмства з філасофскімі працамі, што прысвечаны асвятленню пытанняў прыроды грамадскай свядомасці, яе структуры, формаў, узроўняў; даследаванню ролі нацыянальнай самасвядомасці і культуры ў генезісе этнасаў і сацыялізацыі асобы; аналізу гісторыі філасофскай думкі на Беларусі (К.П.Буслаў, Э.К.Дарашэвіч, У.В.Мшвеніерадзе, С.А.Падокшын, В.І.Талстых, А.К.Уледаў); вывучэнню праблем народнай педагогікі (І.С.Кон, У.М.Конан, В.А.Салееў, А.П.Сідзялькоўскі, І.В.Суханаў), вуснай народнай творчасці (Ш.М.Гусейнаў, А.І.Пятрухін, А.І.Самаль, В.А.Фядотаў, У.І.Чарноў, К.В.Чыстоў).

Метадалагічную аснову даследавання склалі таксама працы па тэорыі і практыцы маральнага выхавання В.С.Багданавай, М.І.Болдырава, Д.І.Вадзінскага, К.В.Гаўрылавец, А.Г.Драбніцкага, І.А.Каірава, А.С.Макаранкі, Э.А.Манасзона, І.С.Мар'енкі, Л.І.Рувінскага, В.А.Сухамлінскага, І.Ф.Харламава, якія на ўзроўні навуковых канцэпцый раскрываюць мэты, прынцыпы, метады, змест маральнага выхавання, выяўляюць дыялектыку і супярэчлівасць працэсу маральнага станаўлення асобы, знаёмяць з методыкай і ўмовамі эфектыўнасці выхаваўчай работы па фарміраванні маральна сталай асобы.

Аналіз літаратуры этнапедагагічнага накірунку (Х.Х.Батчаева, А.І.Бугаёва, Г.Н.Волкаў, М.Б.Гуртуева, А.Э.Ізмайлаў, Р.Я.Кальювез, В.Я.Кашалёва, Ш.А.Мірзоеў, Т.Т.Мунзук, К.Пірліеў, Ю.А.Рудзь, С.М.Саіпбаеў, Р.А.Санабасава, Г.Д.Сундуй, Я.І.Ханбікаў, Б.М.Хаўратовіч, А.Л.Хрыстава, а таксама працы беларускіх аўтараў Е.Г.Андрэевай, Г.П.Арловай, В.С.Болбаса, А.А.Грымаця, М.С.Кавалевіч, І.І. Калачовай, К.А.Кулінковіча, М.Ф.Піліпенкі, Л.В.Ракавай, С.В.Снапкоўскай, В.В.Сямёнавай, Я.І.Сярмяжкі) даў магчымасць распрацаваць паняційна-катэгарыяльны апарат даследавання, канкрэтызаваўшы яго тэарэтыка-метадалагічную аснову.

Фарміраванню правільнага падыходу да даследавання дадзенай праблемы садзейнічаюць таксама шматлікія працы этнографаў (В.К.Бандарчык, Д.Г.Булгакоўскі, М.Я.Грынблат, Я.Ф.Карскі, А.К.Кіркор, Ю.Ф.Крачкоўскі, А.А.Мялешка, М.Я.Нікіфароўскі, Е.Ф.Раманаў, В.С.Цітоў, П.В.Шэйн, П.М.Шпілеўскі) і багаты фальклорны матэрыял.

Зыходзячы з прынятай у філасофскай літаратуры трактоўкі паняцця ідэі, мы разумеем пад ідэяй маральнага выхавання ў народнай педагогіцы форму пазнання выхаваўчага працэсу, якая ўключае ў сябе ўсведамленне мэты

выхавання і шляхоў педагагічнага ўздзеяння на маральнае станаўленне выхаванцаў. Ідэя маральнага выхавання, падсумоўваючы вопыт папярэдняга развіцця ведаў у галіне педагагічнай практыкі народа, з'яўляецца ў той жа час актыўным звяном у працэсе ўдасканалення дзейнасці выхавальнікаў па фарміраванні маральна сталай асобы. Такім чынам, раскрыццё народна-педагагічных ідэй маральнага выхавання патрабуе вызначэння мэты маральнага выхавання, шляхоў і сродкаў педагагічнай дзейнасці, характарыстыкі выхаваўчай практыкі народа, у якой актуалізуецца тая ці іншая ідэя.

На аснове этнапедагагічнага аналізу этнаграфічных і фальклорных крыніц у дысертацыі робіцца вывад, што ў народнай педагогіцы найвышэйшай мэтай на шляху наступовага маральнага ўдасканальвання асобы выступаў маральны ідэал народа. Ён служыў фактарам захавання ўпарадкаванасці ў жыцці кожнага чалавека, прызваным дакладна размяжоўваць станоўчае і негатыўнае ва ўзаемаадносінах людзей з акцэнтаваннем на станоўчым, маральна дасканалым, дапамагаць у прыняцці маральна правільнага рашэння, у выпраўленні памылак. Даследаванне паказала, што маральны ідэал беларускага народа грунтуецца на трывалым фундаменце яго нацыянальнага характару, на самаўяўленні беларусаў пра свае якасці, якія залежаць ад уплыву шматлікіх фактараў. Прыродна-геаграфічныя ўмовы жыццядзейнасці беларусаў у пэўнай ступені прадвызначылі спакойны, ураўнаважаны характар, паэтычнасць, мяккасць натуры беларуса, схільнасць да роздуму. Барацьба з прыродай за хлеб, за ўраджай навучыла яго небываламу цярпенню ў пераадоленні цяжкасцей і нераацкод, цягавітасці. Самаадданая, напружаная праца на зямлі загартавала беларуса, надзяліла надзвычайнай працавітасцю і падаравала глыбокае пачуццё пашаны да зямлі.

Унікальнае геапалітычнае становішча Беларусі часта ператварала яе землі ў арэну крывапралітных падзей. Пры гэтым беларускі народ ніколі не развязваў вайны першым, толькі адчайна абараняў сваю радзіму ад шматлікіх захопнікаў. Таму такія якасці, як вынослівасць, стойкасць, мужнасць, характэрныя для беларусаў.

Тэрытарыяльнае размяшчэнне Беларусі ў геаграфічным цэнтры Еўропы садзейнічала ўзаемапранікненню рэлігійных традыцый, што паўплывала на замацаванне ў беларускім нацыянальным характары талерантнасці – павагі да людзей з іншым складам мыслення, іншым светаўспрыманнем; памяркоўнасці.

У сукупнасці названых станоўчых рыс беларускага нацыянальнага характару аўтар бачыць аснову для фарміравання маральнага ідэалу народа. Узяўшы з невычэрпнай народнай душы такія прыгожыя рысы, як працавітасць, патрыятызм, чалавечнасць, талерантнасць, цярплівасць, выхавальнікі развівалі тыя рысы, якія не супярэчаць нацыянальнаму духу. І гэта зразумела: калектыўная асоба народа не павінна выключацца з паўнаты гарманічнага развіцця на карысць перавагі абмежаванага кола маральных каштоўнасцей. У выніку такога творчага працэсу і нараджаецца маральны ідэал народа.

Раскрыццё ідэй маральнага выхавання ў народнай педагогіцы цесна звязана з выяўленнем народна-педагагічных сродкаў і метадаў, з дапамогай якіх выхавальнікі дасягалі выніковасці педагагічных уздзеянняў на асобу дзіцяці. Багацце і разнастайнасць метадаў маральнага выхавання, назапашаных беларускай народнай педагогікай, тлумачыцца значнасцю, якую надавалі выхавальнікі фарміраванню маральна прыгожай асобы, разуменнем, што маральнасць як прынцып ладу жыцця чалавек атрымлівае толькі ў выхаванні, якое павінна пачынацца з першых дзён з'яўлення на свет новага чалавека і ажыццяўляцца дыферэнцыравана з улікам узроставых і палавых асаблівасцей выхаванцаў.

Каб стварыць цэласнае ўяўленне аб сукупнасці метадаў і прыёмаў маральнага выхавання ў народнай педагогіцы, выявіць у іх агульнае, істотнае, раскрыць прызначэнне і характэрныя прыкметы, уласцівыя спалучэнням асобных метадаў і прыёмаў, дысертант зрабіў спробу класіфікаваць існуючыя ў народнай педагогіцы спосабы педагагічнага ўздзеяння на выхаванцаў, накіраваныя на дасягненне галоўнай мэты маральнага выхавання і падначаленыя ёй. Пры гэтым аўтар абапіраўся на дадзеныя педагагічнай навукі і этнапедагогікі як яе часткі.

На аснове аналітыка-сінтэтычнага вывучэння тэарэтычных распрацовак педагогаў (М.І.Болдыраў, Д.І.Вадзінскі, Т.А.Ільіна, Э.П.Казлоў, Б.Ц.Ліхачоў, І.С.Мар'енка, Э.Ш.Натанзон, В.А.Сласцёнін, Г.І.Шчукіна), этнапедагогаў (В.І.Баймурзіна, Ш.А.Мірзоеў, І.А.Шораў), этнаграфічнага і фальклорнага матэрыялу аўтар у рамках дзейнаснага падыходу да класіфікацыі народна-педагагічных метадаў і прыёмаў вылучае наступныя групы: метады фарміравання маральнага ідэалу народа ў свядомасці асобы, метады арганізацыі адпаведнай маральнаму ідэалу жыццядзейнасці выхаванцаў, метады ацэнкі і стымулявання чалавечых паводзін. У дысертацыі адзначаецца функцыянальнае прызначэнне кожнай групы метадаў, даецца характарыстыка складаных элементаў груп. Аўтар асвятляе таксама пытанне сродкаў маральнага выхавання ў народнай педагогіцы беларусаў, у якасці якіх выступалі народная творчасць, праца, гульні, традыцыі, звычаі, абрады, святы.

У другой главе "*Ажыццяўленне асноўных ідэй маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы*" паказана рэалізацыя галоўных ідэй маральнага выхавання ў народнай педагогіцы беларусаў праз раскрыццё працэсу выхавання працавітасці, патрыятызму, чалавечнасці.

Выхаванне *працавітасці* – якасці, што паказвае на прыхільнасць чалавека да працы, становічае стаўленне да працоўнай дзейнасці, - займае адно з цэнтральных месц у маральным выхаванні беларусаў. Аўтар падкрэслівае, што значнасць працы для беларусаў стала фактарам фарміравання ў свядомасці людзей пераканання, што працавітасць не проста ўваходзіць у склад маральнай культуры чалавека, а з'яўляецца яе галоўным паказчыкам.

У ходзе даследавання мы прыйшлі да вываду, што ў беларускай народнай педагогіцы склаліся пэўныя погляды на працэс фарміравання працавітасці ў

дзяцей. Адным з прынцыпаў выхавання было праяўленне клопату з боку бацькоў аб тым, каб працавітасць стала неад'емнай якасцю новага чалавека, пачынаючы са дня яго нараджэння, аб чым сведчыць радзінная абраднасць беларусаў, паэзія пеinitiaнання.

Значнае месца ў дысертацыі адводзіцца раскрыццю педагагічнай каштоўнасці калектыўных рухавых гульняў, змест якіх часта будаваўся на імітацыі працоўнай дзейнасці чалавека.

У даследаванні адзначаецца, што метад прывучэння рэалізоўваўся ў народнай педагогіцы праз удзел дзяцей у пасільнай працоўнай дзейнасці, у сувязі з чым разглядаюцца ўзроставыя абавязкі хлопчыкаў і дзяўчынак.

Аўтар спыняецца на пытанні развіцця зацікаўленасці выхаванцаў у працы. У прыватнасці, адным з педагагічных сакрэтаў народа ў дысертацыі называецца паступовае далучэнне дзяцей да рамесных работ.

Эфектыўным стымулам фарміравання працавітасці ў падрастаючага пакалення служыла тая акалічнасць, што выбар спадарожніка жыцця быў абумоўлены ў значнай ступені адносінамі яго да працы, аб чым сведчаць шматлікія фальклорныя прыклады, вясельныя абрады.

Сілай міжвольнага ўздзеяння на выхаванцаў валодала само жыццё беларусаў, падпарадкаванае працы, аўтарытэт прадстаўнікоў старэйшага пакалення, заснаваны на адносінах чалавека да сваіх працоўных абавязкаў.

З мэтай дапамагчы выхаванцам зрабіць правільныя вывады з бачнага, асэнсаваць працоўную аснову жыцця і шчасця, прыйсці сэрцам і розумам да прыняцця працавітасці як найважнейшай якасці маральнага ідэалу народа выхавальнікі актыўна выкарыстоўвалі фальклорныя творы.

Даследаванне дазволіла ўстанавіць, што маральныя ўяўленні народа аб цесна ўзаемазвязаных з'явах – працы і працавітасці – раскрываюцца ў беларускіх працоўных святах, якія выступалі ў якасці старажытнага народна-педагагічнага сродку.

У главе асвятляецца працэс узнаўлення ў кожным новым пакаленні такой маральнай якасці, як *патрыятызм*. На аснове аналізу складанага шляху развіцця самасвядомасці беларусаў, падыходаў філосафаў да разумення патрыятызму мы атрымалі поўнае ўяўленне аб этапнасці пераўтварэння сэнсавай нагрузкі паняцця "патрыятызм", яго аб'ёме ў свядомасці народа.

Вывучэнне этнаграфічнай і фальклорнай літаратуры з этнапедагагічнага пункту гледжання паказвае, што выхаванне патрыятызму ў народнай педагогіцы мела некалькі накірункаў. Сярод першых цаглінак у фундаменце патрыятызму асобы народнай педагогікай закладвалася прыхільнасць да месца нараджэння, якое складалася для дзіцяці з кругоў, што паслядоўна пашыраліся, уключаючы спачатку хату, потым двор, вёску, палі, лес, вадаёмы. Гэтыя кругі змяшчалі ў сабе і адносіны з людзьмі: з бацькамі, сваякамі, аднавяскоўцамі, галоўнай фігурай сярод якіх выступала маці. Светаадчуванне маці пераносілася на дзіця. Таму выхаванне прыхільнасці да месца нараджэння, "маленькай" радзімы, звязана ў народнай педагогіцы з выхаваннем любві і павагі да маці

Своеасаблівы тандэм прыроднага і чалавечага акружэння станавіўся для дзіцяці першым самым моцным уражаннем жыцця, якое звязвала чалавека з радзімай назаўсёды. Народная педагогіка мэтанакіравана дапамагала дзіцяці адчуць камфортнасць і адзінства роднага акружэння, чаму садзейнічала выкарыстанне такіх каштоўных педагагічных сродкаў, як загадкі, прыкметы, рамёствы, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Прычыну пашырэння аб'екта патрыятычных пачуццяў аўтар бачыць ва ўплыве культуры беларускага народа, якая адлюстроўвае спецыфічныя рысы нацыянальнай ментальнасці, і ў першую чаргу ва ўплыве такой важнай яе часткі, як беларуская мова.

Адным з важных кампанентаў патрыятызму, адзначаецца ў працы, беларусамі ўсведамлялася вернасць бацькаўшчыне. Імкненне ўмацаваць у выхаванцаў пачуццё адданасці радзіме пабуджала старэйшых звяртацца не толькі да прамых патрабаванняў. Выхавальнікі давалі пажытак дзіцячаму розуму, камбінуючы ў гутарцы прыказкі, наглядныя ўзоры годных паводзін у адносінах да сваёй радзімы казачных герояў, песні пра пачуцці чалавека да айчыны. Беларусы вучылі пераемнікаў даражыць кроўнымі сувязямі з роднай зямлёй, захоўваць ёй вернасць праз атрыманне імі ў спадчыну прызнаных, годных прадаўжэння, узнаўлення духоўных каштоўнасцей, традыцый, звычаяў, абрадаў.

Даследаванне педагагічнай спадчыны бларусаў сведчыць аб тым, што народная педагогіка вялікую ўвагу надавала выхаванню паважлівых адносін да памяці продкаў.

Значнае месца адводзіцца асвятленню выхавання ў падрастаючага пакалення гатоўнасці абараняць радзіму ад ваенных захопнікаў. Пераканаўчасці ў выхаванні дзейснага патрыятызму народныя педагогі дасягалі выкарыстаннем фальклорнага матэрыялу, які даносіў ідэю бязмежнай адданасці радзіме.

Прадметам даследавання ў другой главе з'яўляецца таксама выхаванне *чалавечнасці* ў беларускай народнай педагогіцы. Неабходнасць выпрацоўкі дадзенай якасці даказвалася падрастаючаму пакаленню праз думку, што "Людзі без людзей жыць не могуць" – значыць, павінны вучыцца кантраляваць, прадумваць свае паводзіны, падпарадкоўваць іх прынятым маральным нормам, усведамляць адказнасць перад людзьмі за свае ўчынкі, памятаць пра годнасць другога чалавека, ставіцца да яго з павагай, спачуваннем, зычліва, праяўляючы сумленнасць, велікадушнасць, сціпласць.

Вывучаючы вопыт выхавання чалавечнасці ў беларускай народнай педагогіцы, аўтар прыйшоў да высновы, што чалавечнасць фарміравалася беларусамі праз добразычлівыя адносіны да выхаванцаў, натуральнае супрацоўніцтва з дзецьмі у працэсе выхавання, праз умелы падбор педагагічных сродкаў і метадаў, пры якім улічваліся псіхафізіялагічныя асаблівасці выхаванцаў. У гэтай сувязі ў дысертацыі падрабязна аналізуецца педагагічная каштоўнасць фальклорнай спадчыны народа. Пры дапамозе

вуснай народнай творчасці выхавальнікі перадавалі падрастаючаму пакаленню разуменне народам дабра і зла; ставілі перад выхаванцамі мэту пражыць жыццё годна, каб заслужыць добрую памяць нашчадкаў, будаваць свой лад жыцця ў адпаведнасці з маральным прынцыпам гуманізму: прызнаваць права ўсіх людзей на шчасце, павагу, любоў; асуджалі людскія хібы, адабралі чалавечныя паводзіны.

Педагагічныя назіранні прымушалі бацькоў сцвярджаць чалавечнасць не толькі на словах, але і ўласным прыкладам. Унутрысямейныя адносіны адыгрывалі вялікую выхаваўчую ролю не толькі як крыніца ўзораў праяўлення чалавечнасці для дзяцей і моладзі, але і як школа выпрацоўкі і выпрабавання дадзенай маральнай якасці ў падрастаючага пакалення.

Народная педагогіка вызначала шлях выхавання чалавечнасці праз развіццё ініцыятывы дзяцей у самастойным набыцці жыццёва неабходнага сацыяльнага вопыту ў гульнях і працы. Аўтар таксама робіць акцэнт на ролі, якую адыгрывалі звычаі і абрады ў выхаванні чалавечнасці.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

1. Распрацоўка тэарэтыка-металалагічных асноў даследавання праблемы маральнага выхавання ў народнай педагогіцы дазволіла сфарміраваць паняційна-тэрміналагічны апарат, у прыватнасці, прапанаваць свой варыянт вызначэння сутнаснага зместу аб'екта даследавання. Народная педагогіка – галіна вопыту народа па пытаннях навучання і выхавання падрастаючых пакаленняў, які знаходзіць выяўленне ў сукупнасці педагагічных ведаў, уменняў і навыкаў педагагічнай дзейнасці на ўзроўні штодзённай свядомасці. Паняцце "народная педагогіка" не тоеснае паняццю "этнапедагогіка". Этнапедагогіку мы разглядаем як галіну педагагічнай навукі, якая вывучае народную педагогіку [7, 8, 9].

2. У народнай педагогіцы сфарміравалася паняцце аб тым, якім павінны быць маральны воблік падрастаючага пакалення. Маральныя патрабаванні народа ўвасобіліся ў форму маральнага ідэалу, які адлюстроўвае мэту маральнага выхавання. Маральны ідэал беларускага народа з'яўляецца прадуктам своеасаблівай формы творчасці, якая праяўляецца ў працы народа над агульначалавечымі каштоўнасцямі і над рысамі нацыянальнага характару, які фарміраваўся пад уплывам прыродна-геаграфічных, гістарычных, сацыяльных фактараў, што сведчыць аб спецыфіцы маральнага ідэалу беларусаў, якая перадаецца не пэўнай унікальнай якасцю, а ступенню значнасці той ці іншай якасці для беларускага народа. Такім чынам, маральны ідэал народа не супярэчыць, але і не супадае поўнасцю з агульначалавечымі каштоўнасцямі; бясспрэчны жа ўплыў нацыянальнага характару на фарміраванне маральнага ідэалу беларусаў заключаецца ў імкненні захаваць яго лепшыя якасці і ўзнаўляць іх у кожным пакаленні.

Такімі якасцямі сталі працавітасць, патрыятызм, чалавечнасць, талерантнасць, памяркоўнасць, беражлівасць, пераадоленне пакорлівасці, пасіўнасці. Першыя тры з названых якасцей склалі аснову маральнага ідэалу беларускага народа. Працавітасць з'яўляецца ўмовай існавання беларускага этнасу. Трывалае яе замацаванне, як сэнсу існавання чалавека, стымулу яго дзейнасці, было абумоўлена прыроднымі фактарамі (прыходзілася пераадольваць значныя цяжкасці ў барацьбе з балотамі, лясамі за зямлю для ворыва, трэба было забяспечваць вялікую сям'ю неабходнымі бытавымі і гаспадарчымі рэчамі). Патрыятызм беларусаў фарміраваўся разам з развіццём самасвядомасці народа ў адказ на шматлікія ваенныя канфлікты, якія разгараліся на беларускіх землях з прычыны іх буфернага геапалітычнага становішча. Зусім натуральным было і сцвярджэнне ў маральным ідэале народа чалавечнасці, якую беларусы разглядалі як галоўную ўмову добрых узаемаадносін з людзьмі, як супрацьпастаўленне жорсткаму абыходжанню з працоўнымі.

Маральны ідэал беларусаў змяшчае вербальна-абагульнены (маральныя нормы, прынцыпы) і персаніфікавана-вобразны (рэальныя людзі, казачныя персанажы, героі легенд, паданняў, сказаў) элементы[1].

3. Сукупнасць разнастайных сродкаў і метадаў маральнага выхавання была вызначана створаным у народзе вобразам маральна прыгожага чалавека, разуменнем таго, што чалавек здабывае маральныя якасці толькі ў выхаванні, што вяло да ўсведамлення народнымі педагогамі сваёй адказнасці за маральнасць дзяцей.

Пошукі падрастаючым пакаленнем маральна-каштоўнасных арыенціраў быцця выхавальнікі накіроўвалі на засваенне пэўных маральных нормаў, правілаў, прынцыпаў, на фарміраванне маральнага ідэалу народа пры дапамозе метаду прамога і ўскоснага патрабавання, які рэалізоўваўся праз прыёмы парады, намёку, просьбы, указання, наказу, благаславення, пажадання; метаду пераканання, што рэалізоўваўся праз растлумачэнне, гутарку, прыклад. У якасці сродкаў уздзеяння на маральную свядомасць выхаванцаў выступалі вусная народная творчасць, грамадская думка, аўтарытэт старэйшых, традыцыі, звычаі, абрады, пры дапамозе якіх народ актыўна ўздзейнічаў на пачуццёвую сферу свядомасці выхаванцаў, разумеючы, што проста маральныя веды не прыводзяць да адпаведных паводзін, што толькі будучы эмацыянальна афарбаванай тая ці іншая інфармацыя можа стаць стымулам да дзеяння, веды павінны быць сагрэты цеплынёй чалавечых пачуццяў.

Народная педагогіка мэтанакіравана падводзіла выхаванцаў да дасягнення найбольш поўнай адпаведнасці маральнаму ідэалу народа, з прычыны чаго практычная жыццядзейнасць падрастаючага пакалення была

арганізавана метадамі прывучэння праз паказ, растлумачэнне, гульню, працу, звычаі, абрады; практыкавання.

Такія ж метады, як выпрабаванне, заахвочванне (пахвала, адабрэнне, узнагарода) і пакаранне (асуджэнне, вымова, пагроза, заўвага, праклён, цялеснае пакаранне) у сукупнасці іх выхаваўчых прыёмаў паказвалі чалавеку дасягненні і памылкі яго жыццёвай пазіцыі, яго паводзін (ацэначны аспект), эмацыянальна замацоўвалі і стымулявалі станоўчыя паводзіны, стрымлівалі імкненне да амаральных учынкаў (стымулюючы аспект).

Народна-педагагічны комплекс сродкаў і метадаў, якія ўплывалі на маральны рост чалавека, валодаў вылатнымі якасцямі, натуральнымі рухомымі сувязямі паміж кампанентамі гэтага комплексу, узаемадзеяннем, узаемазалежнасцю, узаемапераходам, узаемадапаўненнем асобных структурных частак [2, 4, 5].

4. Аналіз этнаграфічных прац, твораў вуснай народнай творчасці дазваляе сцвярджаць, што праца разглядалася беларусамі як сродак самасцвярджэння асобы, крытэрый яе маральнай годнасці і сацыяльнай сталасці, як умова яе дабрабыту, фарміравання лепшых чалавечых якасцей. Таму зразумела, чаму выхаванню працавітасці ў беларускай народнай педагогіцы ўдзялялася вялікая ўвага. Выхаванне працавітасці ў падрастаючага пакалення ўключала ў сябе фарміраванне патрэбнасці, прыхільнасці да працы, разуменне значнасці добрасумленнай і стараннай працы ў жыцці кожнага чалавека, авалоданне канкрэтнымі працоўнымі ўменнямі і навыкамі, павагу да людзей працы і вынікаў іх працоўных намаганняў.

У фарміраванні працавітасці былі задзейнічаны амаль усе сродкі і метады маральнага выхавання, якія прымяняліся народам з улікам прынцыпа прыродаадпаведнасці. Маральныя патрабаванні падаваліся пры выкарыстанні калыханак, забаўлянак, прыказак, казак, песень, найбольш адпаведных дзіцячым псіхафізіялагічным асаблівасцям. Гістарычная культурная спадчына зберагла каштоўны вопыт уключэння падрастаючага пакалення ў працоўную дзейнасць з дапамогай гульняў, пасільных працоўных даручэнняў, якія адрозніваліся па палавой і ўзроставай прыкмеце; праз далучэнне да яркай атмасферы працоўных святаў, абрадаў, якая садзейнічала фарміраванню прыхільнасці да працы. Працавітасць кожнага чалавека ацэньвалася з дапамогай трапных народных выслоўяў, якія ганьбавалі нядбайнасць, гультайства і ўслаўлялі здольнасць да працы, якая выпрабоўвалася пры зборы талакі, на вячорках, дажынках, вяселлі і іншых звычаях. Узаемадзеянне мэтавага, аперацыйна-дзейнаснага, змястоўнага кампанентаў выхавання працавітасці забяспечвала яго высокую выніковасць [3].

5. Ва ўмовах сацыяльнай няроўнасці патрыятызм прапаўнікоў не адпавядаў сучаснаму разуменню гэтага тэрміна. Змест патрыятызму людзей

працы абмяжоўваўся ў асноўным маральным аспектам, бо на ўзроўні паўсядзённай свядомасці, якая не прадугледжвае тэарэтычнага афармлення, яны не маглі падняцца да ўсведамлення агульнадзяржаўных інтарэсаў, тым больш, што інтарэсы дзяржавы не заўсёды супадалі з імкненнямі народа, былі далёкімі і незразумелымі для простых людзей. Але трэба адзначыць, што ў сітуацыях вясннага супрацьстаяння захопнікам адбывалася поўнае супадзенне палітычнага і маральнага аспектаў патрыятызму народных мас.

Выхаванне патрыятызму ў беларускай народнай педагогіцы ўключала прывіццё духоўнай прыхільнасці да месца нараджэння, вернасці сваёй айчыне, любві і павагі да гістарычнага мінулага, спачування да народных пакут, гатоўнасці абараняць радзіму ад знешніх ворагаў.

Народная педагогіка мудрая тым, што выхаванне патрыятызму ў малодшага пакалення засноўвалася на спалучэнні рацыянальных і эмацыянальных спосабаў уздзеяння на асобу. Пачуцці, без якіх немагчыма трансфармаваць маральныя патрабаванні грамадства ў асобныя ўстаноўкі паводзін дзейнічаць згодна з маральным ідэалам народа, фарміраваліся на аснове свядомых адносін да маральных нормаў, правілаў паводзін, што засвойваліся дзецьмі ў працэсе выхавання пад уздзеяннем бацькоўскага благаслаўлення, наказу, указанняў, парад старэйшых, сілы прыкладу, аўтарытэту дарослых, логікі растлумачэння паводзін у адпаведнасці з грамадскай думкай, умела падабраных пры перакананні доказаў на карысць тых ці іншых пачуццяў, дзеянняў, з якіх складаецца патрыятызм. Эфектыўнасці выхавання патрыятызму садзейнічала мастацкая аформленасць народна-педагагічных сродкаў. Народная творчасць, народныя святы, традыцыі, звычаі, абрады, выступаючы ў ролі такіх выхаваўчых сродкаў, давалі дзецям магчымасць адчуць, што ёсць бацькаўшчына, духоўна пароднішца з роднай зямлёй, палюбіць свой народ [6].

6. Сацыяльная неабароненасць простых людзей, цяжкія ўмовы жыцця, негарантаванасць асноўных правоў чалавека працы, шматлікія войны, якія адбываліся па тэрыторыі Беларусі і суправаджаліся значнымі чалавечымі ахвярамі, нястачай насельніцтва, жорсткім абыходжаннем з ім з боку заваёўнікаў, прыводзіла да таго, што народ вялікае значэнне надаваў фарміраванню такой маральнай якасці, як чалавечнасць. Менавіта чалавечнасць у паўсядзённых узаемаадносінах людзей сцвярджала прынцып гуманізму, які абвяшчаў права чалавека на шчасце, прыстойнае існаванне, абарону годнасці асобы.

Выхаванне чалавечнасці прадугледжвала набыццё падрастаючым пакаленнем добразычлівасці, спачування, павагі да людзей, сціпласці, сумленнасці, шчырасці, велікадушнасці. Вялікую ролю ў гэтым працэсе адыгрывалі ўнутрысямейныя адносіны (паважлівыя адносіны паміж бацькамі, бацькоў да старэйшых, поўныя любві адносіны да малодшага пакалення), якія

служылі прыкладам праяўлення чалавечнасці, пацвярджэннем маральных патрабаванняў, выказаных у мастацкай форме фальклорных твораў, што садзейнічала фарміраванню перакананасці выхаванцаў у неабходнасці ўважлівасці, спагадлівасці, зычлівасці да другога чалавека. Першапачатковае пераймание паводзін старэйшых у гульнях, у зносінах з членамі сям'і станавілася для дзяцей школай фарміравання чалавечнасці. Адным з асноўных сродкаў і метадаў прад'яўлення маральных патрабаванняў да выхаванцаў і прывучэння іх жыць на законах чалавечнасці былі народныя звычаі гасціннасці, звычай Бабіны, талака, вяселыны, валачобны, пахавальны абрады, народныя святы з іх атмасферай зычлівасці, павагі, шчырасці і гармоніі ва ўзаемаадносінах людзей. Спосабы чалавечных паводзін, набытыя ў сям'і, гульнёвай дзейнасці, пры выкананні звычаяў перарасталі ў навыкі і звычкі маральных паводзін. Адпрацаваныя шляхам прывучэння і практыкавання канптоўныя спосабы паводзін набывалі гібкасць пры пераносе маральных звычак у новыя сітуацыі, калі трэба было праявіць спагадлівасць, аказаць дапамогу сіротам, жабракам, калекам, удовам [3].

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ ПРАЦ

1. Рудкоўская А.Э. Маральны ідэал у беларускай народнай педагогіцы // Веснік ВДУ. - 1997. - № 2(4). - С. 39-42.

2. Крываносава А.Э. Асноўныя сродкі і метады маральнага выхавання ў народнай педагогіцы беларусаў // Веснік ВДУ. - 1998. - №3(9). - С.21-26.

3. Рудковская Е.Э. Нравственное воспитание и народная педагогика // Матэрыялы навук. гуманітарнай студэнцкай канф., Віцебск, 6-7 мая 1993 г. МА РБ. Саюз моладзі Беларусі. ВДПІ. - Віцебск, 1993. - С.4-9.

4. Рудковская Е.Э. Народная педагогика в учебно-воспитательной работе школы // Проблемы социализации детей и подростков в современной общественной ситуации: Материалы обл. научно-практ. конф., Витебск, 11-12 мая 1995 г. / МОиН РБ. ВГУ. Витебское обл. объединение орг. раб. с детьми и подростками. - Витебск,1996. - С.56-58.

5. Рудкоўская А.Э. Выхаваўчы патэнцыял народнай педагогікі школе // Морально-правовое воспитание: опыт, проблемы, перспективы: Материалы обл. научно-практ. конф., Витебск, 25 февраля 1997г. /МО РБ. ВГУ. Витебское обл. управление образования. Обл. объединение внешк. раб. - Витебск, 1998. - С. 16.

6. Рудкоўская А.Э. Ідэя выхавання патрыятызму ў беларускай народнай педагогіцы // Молодежь. Новое поколение. Личность: Материалы респ. научно-практ. конф., Витебск, 7-8 мая 1998 г. / Госком по делам молодежи РБ. МО РБ. ЦК БПСМ. Ассоциация студентов вузов Витебской обл. - Витебск, 1998. - С.155-159.

7. Рудковская Е.Э. Народная педагогика и формирование духовного мира личности // Роля сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у фарміраванні каштоўнасных арыентацый будучага настаўніка: Тэз. дакл. рэсп. навукова-практ. канф., Віцебск, 14-15 снежня 1995 г. / МАіН РБ. ВДПІ. Віцебскае аддзяленне Бел. Фонду Сораса. - Віцебск, 1994 - С.77.

8. Рудкоўская А.Э. Этнапедагагічныя веды – неабходная састаўляючая прафесійнай культуры педагога // Профессиональная культура педагогов как определяющий фактор обновления школы: Тез. докл. респ. научно-методич. конф., Витебск, 14-14 мая 1997 г. / ВГУ. Витебский обл. ИПКиПРРиСО. - Витебск, 1997. - С. 20-21.

9. Рудкоўская А.Э. Народная педагогіка ў сацыялізацыі асобы // Молодежь в процессе социализации: Тез. докл. респ. научно-практ. конф., Витебск, 7-8 мая 1997 г. / Госком по делам молодежи РБ. МО РБ. ВГУ. Ассоциация студентов вузов Витебской обл. - Витебск, 1998. - С.58-59.

10. Рудкоўская А.Э. Беларускія вячоркі // Методические рекомендации в помощь организаторам летнего отдыха детей: Сб. ст. / Отв. за выпуск В.И.Турковский, С.З.Ловцова. - Витебск,1994. - С.58-60.

11. Рудкоўская А.Э. Віктарына па матывах беларускай народнай творчасці // Методические рекомендации в помощь организаторам летнего отдыха детей: Сб. ст. / Отв. за выпуск В.И.Турковский, С.З.Ловцова. - Витебск, 1995. - С. 27-29.

# Р Э З Ю М Е

*Крываносава Алена Эдвардаўна*

***Ідэі маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы***

**Ключавыя словы**: народная педагогіка, маральнае выхаванне, ідэя выхавання, маральны ідэал народа, сістэма выхаваўчых сродкаў і метадаў, працавітасць, патрыятызм, чалавечнасць.

**Аб'ект даследавання** – беларуская народная педагогіка.

**Прадмет даследавання** – ідэі маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы.

**Мэта даследавання** – на аснове вывучэння, аналізу, абагульнення этнапедагагічнай літаратуры, этнаграфічнага, фальклорнага матэрыялу беларускага народа раскрыць вядучыя ідэі маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы: ідэі выхавання працавітасці, патрыятызму, чалавечнасці.

У працэсе даследавання выкарыстоўваліся наступныя **метады**: параўнальны аналіз і абагульненне філасофскіх, педагагічных, этнапедагагічных, этнаграфічных прац; падбор і функцыянальны аналіз матэрыялаў беларускай вуснай народнай творчасці ў кантэксце тэмы даследавання.

Вынікамі даследчай працы з'явіліся распрацоўка тэарэтыка-метадалагічных асноў даследавання праблемы ідэй маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы, вызначэнне галоўнай мэты маральнага выхавання ў народнай педагогіцы беларусаў, класіфікацыя народна-педагагічных метадаў і прыёмаў, раскрыццё працэсу ажыццяўлення ідэй маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы (выхавання працавітасці, патрыятызму, чалавечнасці).

Атрыманыя ў ходзе даследавання звесткі ў галіне маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы могуць быць выкарыстаны ў сістэме бесперапыннай адукацыі і выхавання: у сямейным выхаванні, самавыхаванні, у вучэбна-выхаваўчым працэсе дзіцячых садкоў і школ, у лекцыйных курсах і на семінарскіх занятках па гісторыі педагогікі, этнапедагогіцы, у сістэме павышэння кваліфікацыі педагогаў.

# РЕЗЮМЕ


*Кривоносова Елена Эдвардовна*

***Идеи нравственного воспитания в белорусской народной педагогике***

**Ключевые слова**: народная педагогика, нравственное воспитание, идея воспитания, нравственный идеал народа, система воспитательных средств и методов, трудолюбие, патриотизм, человечность.

**Объект исследования** – белорусская народная педагогика.

**Предмет исследования** – идеи нравственного воспитания в белорусской народной педагогике.

**Цель исследования** – на основе изучения, анализа, обобщения этнопедагогической литературы, этнографического, фольклорного материала белорусского народа раскрыть ведущие идеи нравственного воспитания в белорусской народной педагогике: идеи воспитания трудолюбия, патриотизма, человечности.

В ходе исследования использовались следующие **методы**: сравнительный анализ и систематизация философских, педагогических, этнопедагогических, этнографических работ; подбор и функциональный анализ материалов белорусского устного народного творчества в контексте темы исследования.

Результатами исследовательской работы явились разработка теоретико-методологических основ исследования проблемы идей нравственного воспитания в белорусской народной педагогике, определение главной цели нравственного воспитания в народной педагогике белорусов, классификация народно-педагогических методов и приемов, раскрытие процесса воплощения идей нравственного воспитания в белорусской народной педагогике (воспитания трудолюбия, патриотизма, человечности).

Полученные в ходе исследования сведения в области нравственного воспитания в белорусской народной педагогике могут быть использованы в системе непрерывного образования и воспитания: в семейном воспитании, самовоспитании, в учебно-воспитательном процессе детских садов и школ, в лекционных курсах и на семинарских занятиях по истории педагогики, этнопедагогике, в системе повышения квалификации педагогов.

# SUMMARY

**Krivonosova Elena Edvardovna**

## Ideas of Moral Education in Belarusian folk pedagogics

**Key words**: folk pedagogics, moral education, an idea of upbringing, a moral ideal of people, a system of educational means and methods, industry, patriotism, humaneness.

**The object of the research** - Belarusian folk pedagogics.

**The subject of the research** - ideas of moral education in Belarusian folk pedagogics.

**The aim of the research** - to reveal the main ideas of moral upbringing: ideas of industry, patriotism and humaneness in Belarusian folk pedagogics on the basis of the study, analysis and survey of ethno-pedagogical literature, ethnic materials and folk sources of the Belarusian people.

**The methods used**: include comparative analysis and systematization of philosophical, pedagogical and ethnic sources, selection and functional analysis of Belarusian folklore in the context of the theme of the research.

The results of the research are the working out of theoretical and methodological foundations of the problem of the ideas of moral education investigation in Belarusian people`s pedagogics, the definition of the main aim of moral education in the folk pedagogics of the Belarusians, the classification of methods, techniques and the content of moral education in Belarusian folk pedagogics.

The received data can be used in the system of continuous education and upbringing in family and self-education, in the educational process in nursery and secondary schools, in the lecture courses and seminars on the history of pedagogics and ethnopedagogics, in teacher professional development.